# Душэўная размова з артыстам

Летняя творчая сустрэча з заснавальнікам беларускага фольк-мадэрну, лідэрам легендарнага гурта "Палац" Алегам Хаменкам адбылася Менскай сядзібе ТБМ імя Ф. Скарыны пад дэвізам "Дзяжурны па краіне".

Госці сядзібы адзначылі, што не хапае сустрэч з творцамі, не стае інтэрактыўных ток-шоў з беларускамоўнымі выканаўцамі. У такіх умовах магчымасць пакантактаваць з папулярным выканаўцам, выкладчыкам БДУКіМ, надзвычай каштоўная.

Да закрыцця "Аўтарадыё", на хвалях радыёстанцыі выходзіла аўтарская праграма Алега Хаменкі з вядомымі дзеячамі музычнай культуры "Брама існасці".

Гурт "Палац" пад яго нязменным кіраўніцтвам браў удзел ў фестывалях у Заходняй Еўропе і ў краінах СНД. Шматгалосныя спевы, спалучэнне розных народных інструментаў, смелае выкарыстанне магчымасцяў сучасных сінтэзатараў вызначаюць яго стылістыку. Артыст праходзіў у паўфінал адборачнага туру да "Еўрабачання-2008".

Алег Хаменка выканаў народныя песні ў сваёй апрацоўцы. Яго моцны голас гучыць мужна і пранікнёна, з дзесяткамі адценняў, нагадваючы цэлы аркестр.

Спевы перапляталіся з разважаннямі аб нашым культурным кантэксце, якому ўласцівы білінгвізм і талерантнасць.

Спявак выказаў думку, што ў культуры і ў грамадскім жыцці варта ставіць мэты са стваральнай скіраванасцю. У шчырай гутарцы са слухачамі гаворка ішла пра каштоўнасці, якія яднаюць народ. Радзіма, мова, кніга, помнік.

На жаль, матулі думаюць часцей пра тое, як накарміць, а не як выхоўваць. Ці ёсць час пагаварыць па душах?

- Што застанецца сярод запамінальных вобразаў Беларусі? Куды нявесты будуць ускладаць кветкі? - разважае артыст.

Алег Хаменка выказаў думку, што трэба было б за народныя сродкі стварыць помнік Божае Маці ў Менску, як манумент Хрысту-Збаўцу ўзвышаецца на гары над Рыа-дэ-Жанэйра. Да такога помніка прыходзілі б людзі са сваімі спадзяваннямі і пачуццямі.

- Восенню 2012 года гурт "Палац" будзе адзначаць 20-годдзе,- падказаў артыст.

Да гэтай падзеі рыхтуецца выданне новага дыска



музычнага калектыву. Акрамя збору фальклору, артыст любіць збіраць народныя казкі ў рознай апрацоўцы. Раней А. Хаменка выпусціў аўдыё-праект "Беларускія народныя казкі" на 10 дысках. Нядаўна ён знайшоў некалькі варыянтаў казкі "Салдат-лекар" і стварыў яе аўдыёзапіс, з музычным суправаджэннем. Але, як лічаць псіхолагі, яна рэкамендавана з 10-гадовага ўзросту.

На пытанне, як закранулі яго народныя спевы, артыст адказаў:

- Калі я ў маладосці граў на вяселлях папулярныя мелодыі, сутыкнуўся з тым, што жанчыны з розных мясцовасцяў пачыналі ўзгадваць сваё роднае і прасілі выканаць іхнія песні.

***Э. Дзвінская.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ